**ПО́ЛАЦКІ ВАКО́ЛЬНЫ ГО́РАД**, Малы пасад. Існаваў у 11 ст. на месцы стараж. паселішча 9–10 ст. і ўсх. часткі *Полацкага Верхняга замка*. Пл. каля 12,5 га. У пач. 12 ст. ўвайшоў у склад пасадскай тэр. Абарончыя ўмацаванні вакольнага горада згадваюцца ў скандынаўскіх сагах «Дзеянні датчан» (мяжа 12–13 ст.) і «Сазе аб Тыдрыку Бернскім» (каля 1250). Крапасныя сцены даследаваў у 1987–88 С.В.Тарасаў. Раскапаны фр-т сцяны даўж. 22 м. Яе аснова – выкладзены з каменю падмурак шыр. 0,6–0,7 м і выш. да 0,4 м. Мураваная выбрукоўка была адначасова і фундаментам, які трымаўся дзякуючы асаблівасцям канструкцыі на масе саміх камянёў, і невял. валам, што прыўзнімаў гародні над тагачаснай дзённай паверхняй. Гародні выконвалі абарончую і гасп. функцыі. Пад падлогай адной з іх знойдзена закапаная дзежка з арганічнымі рэшткамі і кухонным посудам. Гэта абарончая лінія не мела рова. Працяг сцяны выяўлены ў 2002 Дз.У.Дукам. Захаваліся драўляныя ўмацаванні вала. Непасрэдна на мацерыку былі даследаваны гародні, перакрытыя насыпам вала. Такім чынам, у раскопе 1987–88 сцяна была зроблена ў перакладной (руставай) тэхніцы (спалучэнне драўляных і каменных канструкцый), у раскопе 2002 – выключна з дрэва.

*Літ.*: Дук Дз., Тарасаў С. Да пытання тапаграфічнага развіцця Вялікага пасада Полацка ў XI ст. // ГАЗ. Мінск, 2005. № 20; Дук Дз. Полацк у сістэме станаўлення і развіцця сацыятапаграфічнай структуры старажытнарускіх гарадоў IX–XIII стст. // ГАЗ. Мінск, 2008. Вып. 24; Яго ж. Полацкі пасад IX–XVII стагоддзяў: гісторыка-параўнаўчая характарыстыка // Вестн. Полоцкого гос. ун-та. Сер. А. Гуманит. науки. 2009. № 1.

*Дз.У.Дук*, *С.В.Тарасаў*.

Электронный архив библиотеки МГУ имени А.А. Кулешова